УДК 069.15:39(476)

# РЭКАНСТРУКЦЫЯ КАЛЯНДАРНЫХ СВЯТ І ТРАДЫЦЫЙНЫХ АБРАДАЎ МУЗЕЯМІ МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

***К. А. Скур'ят,*** *саіскальнік вучонай ступені кандыдата навук установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», навуковы супрацоўнік дзяржаўнай установы «Мінскі абласны краязнаўчы музей»*

**Анатацыя.** У артыкуле разгледжана папулярызацыя традыцыйных каляндарных свят і абрадаў музеямі Мінскай вобласці. Асноўны акцэнт зроблены на іх рэканструкцыі. У першай частцы артыкула распавядаецца аб значэнні каляндарных свят і абрадаў у жыцці народа. У другой частцы на прыкладзе чатырох музеяў Мінскай вобласці прадэманстраваны асаблівасці рэканструкцыі каляндарных свят і абрадаў цэнтральнага рэгіёна Беларусі.

**Ключавыя словы:** каляндарныя святы, абрад, рэканструкцыя, этнаграфія, музейная дзейнасць, тэатралізаванае прадстаўленне, Мінская вобласць, музей.

# RECONSTRUCTION OF CALENDAR HOLIDAYS AND TRADITIONAL RITUALS BY MUSEUMS OF THE MINSK REGION

***K. Skuryat,*** *Competitor of a Scientific Degree of Candidate of Sciences of the Educational Institution «The Belarusian State University of Culture and Arts», Researcher of the State Institution «Minsk Regional Museum of History and Local Lore»*

**Abstract.** In the article, the author focuses on the popularization of traditional calendar holidays and rituals by museums of the Minsk region. The focus of the article is on the reconstruction of holidays and rituals. In the first part of the article, the author talks about the significance of calendar saints and rituals in the life of the people. In the second part, using the example of four museums in the Minsk region, the author demonstrates the features of the reconstruction of calendar holidays and rituals of the central region of Belarus.

**Keywords:** calendar holidays, rite, reconstruction, ethnography, museum activity, theatrical performance, Minsk region, museum.

Каляндарныя святы Міншчыны з'яўляюцца адной з найважнейшых частак духоўнай культуры насельніцтва краю. Усе яны суправаджаюцца вераваннямі, забаронамі і прадпісаннямі, якія так ці інакш рэгулююць паўсядзённую дзейнасць чалавека [8, с. 333]. Паколькі беларуская этнічная супольнасць з'яўляецца традыцыйна земляробчай, яе абраднасць мае аграрна-магічны характар [7, с. 23]. Сістэма свят, звычаяў і абрадаў фармавалася на ранніх стадыях развіцця грамадства.

У нашы дні каляндарныя святы і абрады страцілі сваё магічнае значэнне, але па-ранейшаму з'яўляюцца носьбітамі нематэрыяльнай спадчыны беларусаў. Захаванне і папулярызацыя народных свят становяцца ўсё больш актуальнымі ва ўмовах глабалізацыі.

Каляндарныя святы і абрады Беларусі грунтоўна даследаваны ў працах А. Ю. Лозка, Т. В. Валодзінай, Т. І. Кухаронак [2; 5; 6]. Цікавы матэрыял пра аграрна-каляндарную абраднасць можна знайсці ў калектыўнай манаграфіі «Грамадскі быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі» [3]. Каляндарна-абрадавая своеасаблівасць Міншчыны была адлюстравана ў калектыўнай манаграфіі «Этнокультурные процессы Центральной Беларуси в прошлом и современности», выдадзенай у 2015 г. [8], і 5-м томе серыі «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў» [7].

У мэтах папулярызацыі нематэрыяльнай спадчыны музеі Мінскай вобласці ўсё часцей выкарыстоўваюць у сваёй рабоце нетрадыцыйныя формы культурна-адукацыйнай дзейнасці – тэатралізаваныя прадстаўленні, рэканструкцыі, музейныя святы. Асноўнай формай рэпрэзентацыі народных святаў і абрадаў з'яўляецца рэканструкцыя. Такая форма работы найбольш ярка выражана ў музеях-запаведніках і краязнаўчых музеях.

Асноўным святам зімовага каляндарнага цыклу з'яўляюцца Каляды. Свята адзначалася з 24 снежня да 6 студзеня ўключна [1, с. 625]. Яскравым прыкладам рэканструкцыі Каляд з'яўляецца тэатралізаваная экскурсія «Каляды», якая праводзіцца ў гісторыка-культурным музеі-запаведніку «Заслаўе». Спачатку наведвальнікаў знаёмяць з музеем-запаведнікам і праводзяць у этнаграфічны комплекс «Млын». Затым каля млына вакол елкі дзеці пад музыку водзяць карагод. Пасля завяршэння карагода групу сустракаюць супрацоўнікі музея ў масках казы і мядзведзя. У народных абрадах каза з'яўляецца сімвалам пладароддзя і багацця, а мядзведзь – здароўя і моцы. Удзельнікі водзяць карагоды, якія суправаджаюцца традыцыйнымі калляднымі песнямі пад гармонік/баян і традыцыйнымі беларускімі танцамі, такімі як «Свінні ў

рэпе», «Лявоніха», «Лавата», «Скалачка». У канцы свята ўдзельнікаў сустракае Дзед Мароз і віншуе са святам: гэта элемент мадэрнізацыі свята, бо Дзед Мароз не мае адносінаў да каляднай традыцыі і як казачны персанаж з'явіўся ў XX ст., але ў савецкія часы стаў неад'емнай часткай зімовых святаў.

«Гуканне вясны» – першае па часе вясновае свята. Было звязана з абуджэннем стваральных сіл прыроды і суправаджалася абрадамі, падчас якіх людзі імкнуліся наблізіць прыход вясны, цяпла і сонечных дзён [1, с. 375]. Яскравым прыкладам рэканструкцыі свята з'яўляецца тэатралізаванае прадстаўленне Чэрвенскага раённага краязнаўчага музея. Свята пачынаецца з народнай песні «Благаславі, маці, вясну сустракаці», якая суправаджаецца карагодам. Вядучы распавядае пра гісторыю і традыцыі свята, яго прыметы і асаблівасці правядзення. Наведвальнікі ўдзельнічаюць у традыцыйных беларускіх дзіцячых гульнях. Напрыклад, падчас гульні «Куры» ўдзельнікі на хуткасць сарціруюць крупу. Падчас гульні «Збяры сняжкі» наведвальнікі разбіваюцца на дзве каманды, якія з завязанымі вачыма збіраюць сняжкі, перамогу атрымлівае той, хто збярэ больш сняжкоў. Пасля гульні члены каманд збіраюцца ў карагод і клікаюць Вясну. Яе ролю выконвае музейны супрацоўнік. Вясна загадвае ўдзельнікам загадкі, а таксама складае прыказкі. Завяршаецца свята развітальным песенным карагодам з аўтэнтычнымі вясновымі песнямі і гушканнем папяровых птушак.

Яскравым прыкладам рэканструкцыі абрадаў у гульнявой форме музеямі Мінскай вобласці служыць рэканструкцыя вясельнага абраду Івянецкім музеем традыцыйнай беларускай культуры. Супрацоўнікі музея сустракаюць маладых з караваем на рушніке. Потым маладых вядуць у майстэрню ткацтва, дзе распавядаюць аб традыцыях беларускага ткацтва, значэнні пасага ў беларускай традыцыі. Маладую садзяць на дзяжу, пакрытую кажухом, – гэты абрад называецца «Пасад». Лічылася, што пры пасадзе на дзяжу перадаюцца доля, багацце, вытворчыя магчымасці. Яшчэ адным рытуалам з'яўляецца абход маладых вакол стала з грамнічнай свечкай (г. зн. асвечанай у храме на свята Грамніцы). Паводле народных уяўленняў грамнічная свечка была надзелена чароўнай сілай, абараняла дом і сям'ю ад навальніцы, пажараў і г. д [8, с. 341]. Рукі маладых падчас рытуалу перавязаны «крыж-на-крыж» рушніком, што сімвалізуе бясконцасць іх кахання. У ткацкай майстэрні маладой загадваюць загадкі аб ткацтве і садзяць за кросны, у ганчарнай – жаніху прапануецца патаўчы крупу ў ступе і адначасова разгадаць загадкі і больш даведацца аб сельскагаспадарчых прыладах працы. Мясцовыя ганчары вырабляюць для маладых збанок, на якім пішуцца пажаданні маладым. Завяршаецца вясельны абрад

замыканнем замка і ўручэннем ключа маладым, што сімвалізуе крэпасць іх адносінаў.

Часам музеі выкарыстоўваюць рэканструкцыі абрадаў як частку больш буйнага мерапрыемства. Прыкладам такой рэканструкцыі служыць гульнявое прадстаўленне «Праводзіны русалкі», арганізаванае супрацоўнікамі Мінскага абласнога краязнаўчага музея да міжнароднай штогадовай акцыі «Ноч музеяў – 2022».

Русальны тыдзень у Беларусі святкуюць праз 8 тыдняў пасля Вялікдня або праз тыдзень пасля свята Тройцы (сёмухі), якая завяршаецца абрадам «Провады русалкі». Паводле традыцыйных вераванняў русалкі – гэта душы дзяўчат-тапельніц або памерлых немаўлят [4].

Удзельнікі абраду водзяць карагод. Тры «русалкі» становяцца так, каб паміж імі атрымаўся трохкутнік. Яны могуць стаяць ці сядзець. Чацвёртая «русалка» займае месца перад удзельнікамі – становіцца першай карагодніцай. Усе ўдзельнікі карагода становяцца адзін за адным і злучаюць рукі. Хлопцы ловяць «русалку», удзельнікі карагоду дапамагаюць лавіць то падымаючы, то апускаючы рукі, загароджваючы імі шлях, «русалкі» спрабуюць шчыкатаць усіх, гучаць абрадавыя песні.

Такім чынам, народныя каляндарныя святы і абрады на тэрыторыі Міншчыны маюць багатую гісторыю і традыцыі, і сёння выклікаючы цікавасць сярод даследчыкаў і наведвальнікаў музеяў. Асноўнай формай рэпрэзентацыі народных святаў і абрадаў з'яўляецца рэканструкцыя. Такая дзейнасць спрыяе абуджэнню цікавасці да нематэрыяльнай спадчыны беларусаў, выхаванню пачуцця гонару і сувязі пакаленняў. З вышэйсказанага вынікае, што музеі Мінскай вобласці садзейнічаюць захаванню і развіццю народных святаў і звычаяў беларусаў.

*1.* Беларускі фальклор : энцыкл. : у 2 т. – Т. 1 : А капэла – Куцця / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2005. – 768 с.

*2. Валодзіна, Т. В.* «Ядраное жыта гаспадара кліча...»: каляндарны год у абрадах і звычаях / Т. В. Валодзіна, Т. І. Кухаронак. – Мінск : Беларуская навука, 2015. – 358 с.

*3.* Грамадскі быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі / В. К. Бандарчык [і інш.] ; пад рэд. В. К. Бандарчыка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 256 с.

*4.* Как прогнать русалок из деревни, чтобы не защекотали до смерти [Электронный ресурс] // Sputnik. – 08.06.2015. – Режим доступа: https://sputnik.by/20150608/1015622798.html. – Дата доступа: 01.04.2023.

*5. Кухаронак, Т. І.* Радзінныя звычаі і абрады беларусаў: канец XIX – XX ст. / Т. І. Кухаронак. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 126 с.

*6. Лозка, А. Ю.* Беларускі народны каляндар / А. Ю. Лозка. – Мінск : Полымя, 2002. – 205 с.

*7.* Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. – Т. 5 : Цэнтральная Беларусь : у 2 кн. – Кн. 1 / В. І. Басько [і інш.]. – Мінск : Вышэйшая школа, 2010. – 847 с.

*8.* Этнокультурные процессы Центральной Беларуси в прошлом и настоящем / А. В. Гурко [и др.] ; науч. ред. А. В. Гурко ; Нац. акад. наук Беларуси, Центр исслед. белорус. культуры, языка и лит., Фил. «Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора им. К. Крапивы». – Минск : Беларуская навука, 2016. – 539 с.